ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№№ 24—25 (857—858) ● ПЯТНІЦА, 29 верасня 1972 г. Цана 3 кап. ● Год выдання XXV

## УЗНАГАРОДА ЗА ВУЧОБУ

Сакратарыят ЦК ВЛКСМ і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР з мэтай заахвочвання студэнтаў вышэйшых навучальных установ увялі значкі «За выдатную вучобу».

Значкамі ЦК ВЛКСМ і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР «За выдатную вучобу» ўзнагароджваюцца студэнты, якія паказалі па выніках вучэбнага года выдатныя веды і дабіліся поспехаў у грамадскай і навукова-даследчай рабоце.

Рашэнне аб узнагародзе значкамі прымаецца саветам універсітэта (факультэта) і адпаведным камітэтам камсамола; пытанне аб узнагародзе студэнтаў вячэрняй і завочнай форм навучання разглядаецца такім жа чынам па прапанове камітэтаў камсамола прадпрыемстваў і калгасаў, саўгасаў і устаноў.

Рашэнне аб узнагародзе значком «За выдатную вучобу» члена ВЛКСМ заносіцца ва ўліковую картку апошняга. Усім узнагароджаным выдаецца пасведчанне. Тым, хто ўзнагароджан другі раз, выдаецца значок другога ўзору з указаннем года ўзнагароды, а ў пасведчанні робіцца адпаведная адзнака. Ю. ДАЛГАРУКАЎ.



## ФІЗІКІ СУСТРАКАЮЦЦА Ў МІНСКУ



МІНУЛЫ тыдзень азнаменаваўся вялікай падзеяй у навуковым жыцці сталіцы нашай рэспублікі: у актавай зале універсітэта адкрыўся першы Усесаюзны сімпозіум па радыяцыйных дэфектах у паўправадніках.

Адкрываючы пленарнае пасяджэнне, акадэмік АН БССР М. М. Сірата адзначыў вялікі ўклад у развіццё гэтага напрамку фізічнай навукі беларускіх вучоных, у прыватнасці вучоных БДУ, арганізатараў цяперашняга сімпозіума.

Ад імя Акадэміі навук БССР, яе прэзідыума ўдзельнікаў сімпозіума — прадстаўнікоў саюзных рэспублік і зарубежных гасцей — вітаў акадэмік Ф. І. Фёдараў.

— Сімпозіум сабраўся напярэдадні вялікага свята ўсяго савецкага народа — 50-годдзя ўтварэння СССР, — гаворыць прарэктар універсітэта прафесар Л. В. Валадзько. — І вельмі знамянальны той факт, што сярод яго ўдзельнікаў ёсць прадстаўнікі ўсіх 15 рэспублік нашай шматнацыянальнай краіны. Шырока прадстаўлены тут буйныя навуковыя цэнтры — Масква, Ленінград, Кіеў, Новасібірск, Баку, Тбілісі, Вільнюс, Рыга, Ерэван, Ташкент, Томск і шэраг іншых. Прысутнічаюць госці з братніх сацыялістычных краін.

Нас радуе, што прадстаўнікі аднаго з самых маладых і бурна развіваючыхся напрамкаў фізікі сабраліся сёння ў Мінску, які за гады Савецкай улады стаў адным з буйнейшых навуковых цэнтраў нашай краіны.

Прафесар Л. В. Валадзько расказаў аб шырокім развіцці даследаванняў па фізіцы паўправаднікоў ва універсітэце, на кафедрах фізікі паўправаднікоў, фізікі цвёрдага цела, радыётэхнікі і фізічнай электронікі і ў аддзеле фізікі і тэхнікі паўправаднікоў нядаўна створанага інстытута прыкладных фізічных праблем і пажадаў гасцям паспяховай работы, плённых дыскусій, прыемнага знаёмства са сталіцай Беларусі і яе славутасцямі.

Першым на ранішнім пасяджэнні выступіў прафесар БДУ В. Д. Ткачоў з аглядным дакладам «Прырода і энергетычны спектр дэфектаў структуры ў крэмніі і германіі».

У дні работы сімпозіума наш карэспандэнт Т. Даніленка сустрэлася з вучоным сакратаром сімпозіума Д. С. Даманеўскім і папрасіла яго расказаць аб значэнні гэтай сустрэчы фізікаў.

— Структуру цвёрдага цела вывучае больш шасцідзесяці працэнтаў фізікаў усяго свету, — сказаў Дзмітрый Сяргеевіч.—Для таго, каб аблегчыць даследаванне будовы крышталаў, з дапамогай розных відаў абпраменьвання ствараюцца дэфекты ў паўправадніковых монакрышталах. Паўправадніковыя прыборы выкарыстоўваюцца ў розных умовах, некаторыя з іх, напрыклад, абпраменьванне часцінкамі высокіх энергій, могуць істотным чынам абумоўліваць іх работу. Радыяцыйная стойкасць паўправаднікоў мае вялікае практычнае значэнне.

У нашым універсітэце паспяхова працуе моцная група фізікаў пад кіраўніцтвам прафесара В. Д. Ткачова.

З 1963 года дасягнуты значныя поспехі ў даследаванні фізікі паўправаднікоў. Правядзенне сімпозіума ў Мінску з'яўляецца прызнаннем заслуг беларускай школы фізікаў, якія займаюцца праблемай радыяцыйных дэфектаў у паўправадніках.

Сімпозіум праходзіў на працягу трох дзён. Яго ўдзельнікі заслухалі і абмеркавалі 124 даклады, сярод іх 20 дакладаў было прадстаўлена фізікамі нашага універсітэта.

*ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЕ*

## *ПАРА СПРАВАЗДАЧ І ВЫБАРАЎ*

**Восень—пара справаздач і выбараў у студэнцкіх прафсаюзных арганізацыях. У гэтым годзе справаздачы і выбары будуць праходзіць пад знакам далейшага паляпшэння работы прафсаюзных арганізацый па ажыццяўленню рашэнняў XXIV з'езда КПСС і XV з'езда прафсаюзаў СССР, пастаноў ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне, мабілізацыі студэнтаў на дастойную сустрэчу 50-годдзя ўтварэння СССР.**

**Важна, каб справаздачы прайшлі на высокім узроўні. Неабходна забяспечыць строгае падтрыманне прафсаюзнай дэмакратыі, інструкцыі аб правядзенні выбараў прафсаюзных органаў.**

**У прафсаюзнай арганізацыі універсітэта немалы вопыт правядзення выбарнай кампаніі. На юрыдычным, гістарычным і іншых факультэтах сходы ў групах праходзяць пры высокай актыўнасці членаў прафсаюза, з крытыкай недахопаў у рабоце. Прафгрупоргі, як і належыць, маюць пісьмовыя даклады. Грунтоўна і канкрэтна абмяркоўваюць поспехі і промахі ў вучэбных справах, наладжванні дысцыпліны.**

**Аднак не на ўсіх факультэтах з поўнай адказнасцю адносяцца да справаздач і выбараў. На старэйшых курсах хімічнага факультэта, напрыклад, прафгрупоргі лічаць, што можна толькі праводзіць выбары, а справаздачы не абавязкова. Гэта грубыя парушэнні прафсаюзнай дысцыпліны.**

**Пасля справаздач і выбараў у прафгрупах, у кастрычніку, пройдуць справаздачна-выбарныя канферэнцыі прафбюро факультэтаў, а таксама справаздачы студэнцкіх саветаў інтэрнатаў. Важна, каб гэтыя канферэнцыі і сходы прайшлі па-дзелавому, з шырокім далучэннем актыву. Ужо цяпер неабходна паклапаціцца аб падборы актыву з тым, каб у састаў прафбюро факультэтаў, студэнцкіх саветаў, інтэрнатаў, прафгрупоргамі былі выбраны студэнты, якія валодаюць арганізатарскімі навыкамі, могуць забяспечыць далейшы ўздым прафсаюзнай работы.**

**М. ДРОЗД,**
**старшыня прафкома БДУ.**

## У ГОНАР ЮБІЛЕЮ

Шырокае распаўсюджанне ў прафсаюзных арганізацыях універсітэта атрымаў заклік масквічоў і ленінградцаў разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу 50-годдзя ўтварэння СССР. У снежні 1971 года ва ўсіх групах адміністрацыйнай часткі, напрыклад, былі прыняты і зацверджаны на агульных сходах прафгрупы індывідуальныя і калектыўныя сацыялістычныя абавязацельствы.

Штомесячна на вытворчых нарадах аддзелаў падводзяцца вынікі.

У маі прафбюро адміністрацыйнай часткі праверыла ход выканання сацыялістычных абавязацельстваў за паўгоддзе і вызначыла пераможцаў спаборніцтва.

Лепшых вынікаў дабілася прафгрупа бібліятэкі (дырэктар І. У. Арэхоўская, прафгрупорг Т. П. Епанчынцава). Ёй прысуджана першае месца. На другім месцы прафгрупа бухгалтэрыі (гал. бухг. Э. І. Бяляўскі, прафгрупорг А. І. Казакова).

Спаборнічаючы ў гонар юбілею краіны, калектыў бібліятэкі накіраваў свае намаганні на прапаганду рашэнняў XXIV з'езда КПСС і XXVII з'езда КПБ, літаратуры па ўсіх галінах ведаў, імкнецца палепшыць бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне студэнтаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў.

Кожны пункт абавязацельстваў быў старанна прадуман, прадугледзелі і пэўную рацыяналізацыю бібліятэчнай работы, запланавалі і арганізавалі рад цікавых дыспутаў. У прыватнасці, у гонар 54-й гадавіны Савецкай Арміі разам з ваеннай кафедрай супрацоўнікі бібліятэкі правялі ў студэнцкіх групах дыспуты аб кнігах на ваенна-патрыятычную тэму.

Ва ўсіх аддзелах бібліятэкі праводзіліся палітінфармацыі, многія супрацоўнікі ўдзельнічаюць у тэарэтычным семінары. Карыстаецца папулярнасцю лекторый «Бібліятэчныя серады». Штотыднёвыя лекцыі садзейнічаюць пашырэнню агульнага кругагляду супрацоўнікаў. Гэтай жа мэце, росту прафесіянальнага майстэрства садзейнічаюць агляды літаратуры па спецыфіцы бібліятэчнай працы.

Праверка ходу сацыялістычнага спаборніцтва паказала, што ўвесь аб'ём работы, запланаванай на першы этап, выканан датэрмінова. Лепшымі аддзеламі прызнаны: аддзел апрацоўкі літаратуры (загадчыца Т. Л. Дудко), сектар замежнай літаратуры (заг. З. М. Шалупенка).

Паспяхова выконвае ўзятыя абавязацельствы калектыў бухгалтэрыі і планавага аддзела. Тут палепшыўся ўлік расходавання грашовых і матэрыяльных сродкаў, ва ўстаноўленыя тэрміны і добрай якасці прадстаўляюцца бухгалтарскія і статыстычныя справаздачы, своечасова выплачваюцца зарплата і стыпендыі.

Супрацоўнікі матэрыяльнага аддзела многа зрабілі для паспяховага правядзення інвентарызацыі і пераацэнкі асноўных фондаў. Вялікую дапамогу аказваюць кафедрам і лабараторыям у вядзенні ўліку і аховы матэрыяльных каштоўнасцей.

Усім супрацоўнікам бухгалтэрыі створаны добрыя ўмовы працы. Прымаюцца меры да механізацыі ўліку і налічэння зарплаты.

Пры падвядзенні вынікаў спаборніцтва адзначана, што ўсе супрацоўнікі бухгалтэрыі займаюцца ў гуртку бягучай палітыкі. На высокім узроўні тут працоўная дысцыпліна.

Цяпер у перадавых прафгрупах пашыраецца рух за камуністычныя адносіны да працы.

Канчатковыя вынікі спаборніцтва ў гонар 50-годдзя ўтварэння СССР будуць падведзены да 55-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

М. АНОСАЎ,
старшыня прафбюро адміністрацыйнай часткі.

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА

### ПАЛІТІНФАРМАЦЫЙ І ГУТАРАК СЯРОД СТУДЭНТАЎ НА ПЕРШАЕ ПАЎГОДДЗЕ 1972-1973 НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

#### ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА І ЭКАНАМІЧНАГА ЖЫЦЦЯ

1. Правядзенне палітінфармацый па важнейшых падзеях палітычнага і эканамічнага жыцця ўнутры краіны і рэспублікі (2—3 разы ў месяц).

2. Саюз непарушны рэспублік свабодных:

— Утварэнне СССР — працяг справы Вялікага Кастрычніка.

— XXIV з'езд КПСС аб нацыянальных адносінах у перыяд камуністычнага будаўніцтва.

— Беларуская ССР — адна з заснавальніц Саюза ССР.

— Савецкі народ — новая гістарычная агульнасць людзей.

— Эканоміка СССР — адзіны народнагаспадарчы комплекс.

#### ПЫТАННІ КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

1. Камуністычная мараль — праяўленне самых справядлівых і высакародных ідэалаў працоўнага чалавецтва:

— XXIV з'езд КПСС аб шляхах і сродках фарміравання новага чалавека.

— Адданасць справе камунізму — вышэйшы прынцып камуністычнай маралі.

— Камуністычны маральны ідэал і барацьба за яго ажыццяўленне.

— Грамадзянскі доўг савецкага чалавека.

— Эстэтыка паводзін і быту.

— Крызіс буржуазнай маралі як выражэнне агульнага крызісу капіталізму.

#### ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ

1. Правядзенне палітінфармацый па важнейшых падзеях міжнароднага жыцця (2—3 разы ў месяц).

2. Дзейнасць Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы па ажыццяўленню знешнепалітычнай праграмы XXIV з'езда КПСС:

— Савецкая праграма міру — дзейсны фактар сусветнай палітыкі.

— Барацьба за ліквідаванне ачагоў вайны, адпор замахам імперыялізму на свабоду і незалежнасць народаў — важнейшы напрамак савецкай знешняй палітыкі.

— Мілітарызм — параджэнне імперыялізму.

— Сацыялістычная садружнасць — ажыццяўленне новага тыпу міжнародных адносін.

— Барацьба КПСС за адзінства сусветнага камуністычнага руху на прынцыпах марксізму-ленінізму, пралетарскага інтэрнацыяналізму.

# ВУЧАЦЦА ПЕРШАКУРСНІКІ

*Рэпартаж*

УСЁ мае свой пачатак. А з чаго пачынаецца прафесія? З першай лекцыі, са зробленай сваімі рукамі рэчы, а можа з першых практычных заняткаў?

У лабараторыі цішыня. Падміргваюць лямпачкамі прыборы. Над імі схіліліся светлыя і цёмныя, кучаравыя і прамавалосыя галовы. Засяроджаныя твары... Ідуць лабараторныя заняткі па фізіцы ў студэнтаў I курса. Другія па ліку і першыя самастойныя.

— Так, гэта другія лабараторныя заняткі ў пятай групе. На першых адбылося агульнае знаёмства. Сёння кожны студэнт ужо атрымаў заданне, — расказвае выкладчык Іван Іосіфавіч Жалнярэвіч. Да заняткаў студэнты прачыталі і заканспектавалі матэрыял адпаведных раздзелаў падручніка, а пасля заканчэння работы кожны павінен прадставіць пісьмовую справаздачу. Вядома, спачатку прыйдзецца нялёгка, асабліва тым, хто даўно скончыў школу. Але, як паказалі назіранні, такія людзі больш працуюць і к канцу першага семестра дасягаюць узроўню сваіх аднакурснікаў. Сённяшняе папаўненне падрыхтавана лепш, чым мінулагодняе. Можа таму заняткі праходзяць цікава, пасіўных на іх бывае мала. Вельмі радуе імкненне многіх рабят да самастойнай работы.

Хто-ніхто ўжо завяршыў работу, дапісваюцца апошнія лісткі справаздачы. Заняткі працягваюцца...

***

А ў гэтай аўдыторыі ідзе семінар па гісторыі КПСС. Вядзе яго дацэнт А. М. Міхайлаў. Тэма — работа У. І. Леніна «Што рабіць?». У праграме тры пытанні. На першае з іх—«Ленін аб значэнні рэвалюцыйнай тэорыі, аб узнікненні і ўнясенні сацыялістычнай свядомасці ў рабочы рух і неабходнасці барацьбы з буржуазнай ідэалогіяй» — адказвае Сяргей Слюсарэнка. Гаворыць спакойна і ўпэўнена, цытуе канспект. Але не ўсё гучыць лагічна і пераканаўча. Арсенцій Міхайлавіч дабіваецца поўнай яснасці пытання, імкнецца даць магчымасць кожнаму выказаць свой погляд на тое ці іншае палажэнне. Так завязваецца спрэчка. Анатоль Шарэнда, Люда Міцкоўская, Анатоль Касячэнка — усе яны не проста пераказваюць раздзелы работы, а стараюцца зрабіць аналіз, сказаць сваё слова.

Цяжка прывыкаць былому школьніку да вузаўскай сістэмы навучання: трэба перабудаваць свой працоўны дзень, нават крыху самога сябе. Удаецца гэта адразу не кожнаму.

Вось да сённяшняга семінара канспект падрыхтавалі не ўсе. Чаму?

— Да мяне бацькі прыязджалі,—кажа адзін.

— А я канспект дома забыў.

Ну, гэта зусім як у школе: «Забыў сшытак дома».

Так, студэнцкае жыццё не лёгкае. Семінар — апошнія гадзіны, і відаць, што многія стаміліся. Сярожа, што сядзіць на апошняй парце, час ад часу глядзіць у акно, а потым нешта шэпча свайму суседу; на «камчатцы» другога раду — дружны шэпт. Многія слухаюць не вельмі ўважліва. Цяжка сканцэнтравацца, калі так многа новых слоў і думак. Цяжка, але трэба. І ў гэтым дапамагаюць першакурснікам выкладчыкі, якія ўмела вядуць гутарку, прывучаюць уважліва чытаць першакрыніцы, рабіць вывады.

Першая гадзіна падыходзіць к канцу. Арсенцій Міхайлавіч падводзіць вынікі.

Л. ДРУЗЕВА.

# РАЗБІРАЕЦЦА ПЕРСАНАЛЬНАЯ СПРАВА...

**Камсамольскае жыццё**

Наташа Пучкаева скончыла ў мінулым навучальным годзе геаграфічны факультэт, працуе настаўніцай. Сёння яе імя запісана ў пратаколе бюро камітэта камсамола побач з апошнім пунктам павесткі дня «Персанальныя справы». Што здарылася? Наташа ж рэгулярна плаціла ўзносы, наведвала камсамольскія сходы, удзельнічала ў камсамольскім жыцці курса: займалася падпіскай, была брыгадзірам на летняй практыцы. Віна яе ў тым, што ўсе пяць год яна не стаяла на камсамольскім уліку. Толькі Наташа лічыць, што гэта зусім і не віна.

— Я лічыла сябе ўсе пяць год камсамолкай, здавала Ленінскі залік. А пра тое, што трэба стаць у камітэце на ўлік, проста не ведала.

Ці так? Уліковую картку, як сказала сама Наташа, яна атрымала ў райкоме, дзе абавязкова папярэджвалі аб тым, што трэба стаць на улік, ды і ў 53-й школе, дзе яна вучылася, не маглі не сказаць аб гэтым. А Наташа стаіць на сваім: «Я не ведала». Выходзіць, не ведала Статута, выходзіць, памыліліся камсамольцы школы № 53, калі прынялі Пучкаеву ў свае рады.

Перад членамі бюро стала нялёгкае пытанне: як правільна разабрацца ў гэтай сітуацыі?

Вядома, вялікая віна тут і камітэта камсамола геафака, і сяброў Наташы. Каб уважліва праводзілі яны штогоднюю зверку дакументаў, то абавязкова выявілі б, хто не стаіць на ўліку.

Кожны чалавек павінен несці адказнасць за свае ўчынкі. Панесла яе і Наташа. Бюро вызначыла меру спагнання: строгая вымова з занясеннем ва ўліковую картку і пісьмо на месца працы.

Некаторыя скажуць: ці не занадта строга? Гэта ж выключны выпадак. На жаль — не выключны. Не стаялі на ўліку выпускнікі фізфака Л. Барткевіч і У. Ганчаронак, супрацоўніца універсітэта І. Кацельнікава. Больш таго, Кацельнікава і Барткевіч не адмаўляюць, што ведаюць усе правілы. Значыць, абыякава адносяцца яны да абавязкаў камсамольца, а таму недастойны насіць гэта высокае званне. Часта такія выпадкі адбываюцца проста ад ляноты, нежадання турбавацца. На першым курсе не выбраў часу зайсці ў камітэт, а там і забыў. Вось тады праз пяць год і разбіраюцца персанальныя справы.

*Прэс-цэнтр камітэта камсамола.*

# ПА ВАЕННАЙ ТЭМАТЫЦЫ

«Бессмяротны подзвіг савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» і «Салдаты партызанскага фронту» — пад такімі назвамі прайшлі канферэнцыі чытачоў, арганізаваныя супрацоўнікамі ваеннай кафедры і аддзела абслугоўвання бібліятэкі. У аснову выступленняў былі пакладзены творы мастацкай і дакументальнай літаратуры — «Жывыя і мёртвыя» К. Сіманава, «Маладая гвардыя» А. Фадзеева, «Блакада» А. Чакоўскага, «Вайна пад стрэхамі» А. Адамовіча, «Праз магілкі» П. Ніліна, вершы М. Дудзіна, «Верныя да канца» В. Казлова, «На акупіраванай зямлі» В. Якавенкі, «Партызаны Вілейшчыны» І. Клімава і М. Гракава, «Вогненныя віхуры» В. Парахневіча і многія іншыя.

З цікавымі дакладамі на канферэнцыі выступілі выкладчыкі ваеннай кафедры Ю. А. Неліхаў і К. Е. Ахрыменка — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, студэнты В. Мацкевіч, А. Пазняк, Г. Лазько, А. Яромін, А. Врублеўскі, Ю. Манілаў і іншыя.





*НА ЗДЫМКАХ: першы калёквіум па анатоміі раслін у студэнтаў I курса біялагічнага факультэта. Вядзе яго дацэнт А. В. ПЯТРЭНКА.*

Фота Д. Чаховіча.

# КАБ НЕ ПАЎТАРЫЦЬ ПАМЫЛАК

Працоўны семестр юбілейнага 1972 года завершан. Амаль двухтысячны будаўнічы атрад БДУ вярнуўся дадому з розных куткоў краіны. Цёпла сустракалі мінчане, студэнты і выкладчыкі БДУ на Мінскім вакзале універсітэцкіх «томічаў» і цаліннікаў. Ажывіліся студэнцкія інтэрнаты, вучэбныя карпусы. З цікавасцю глядзяць першакурснікі на сваіх старэйшых таварышаў у зялёнай форме, моцных і загарэлых. Яшчэ з большай цікавасцю чытаюць надпісы на нарукаўных эмблемах: Уральская вобласць, Томск, Акцябрскі раён, Іена, Сафія, Мінская вобласць, Мінск. І напэўна не ў аднаго паяўляецца думка: «Абавязкова паеду ў атрад наступным летам».

Цяпер рабяты адпачываюць, дзеляцца ўражаннямі, рыхтуюцца да вучобы, а таксама мараць аб будучым працоўным семестры. Некаторыя з іх выявілі жаданне папрацаваць у калгасе на ўборцы бульбы, і па-ўдарнаму, па-цаліннаму працавалі ў полі.

А будучы працоўны семестр пачынаецца ўжо сёння.

Камітэт камсамола універсітэта падвёў вынікі працы штаба СБА, вынікі працоўнага семестра. Гэтым летам у працоўным семестры, прысвечаным 50-годдзю ўтварэння СССР, прынялі актыўны ўдзел 1800 студэнтаў універсітэта, у тым ліку 50 в'етнамскіх студэнтаў.

Асвоена 2 972 570 рублёў капіталаўкладанняў. Гэта дзесяткі пабудаваных жылых дамоў і кашар у Казахстане, сотні розных будаўнічых аб'ектаў у Беларусі і ў Томскай вобласці. Універсітэцкія атрады з гонарам выканалі вытворчыя заданні і ўнеслі свой уклад у выкананне будаўнічага плана дзевятай пяцігодкі.

Праца студэнтаў, заснаваная на прынцыпах самакіравання, строгай дысцыпліны і высокай адказнасці, спалучалася з вялікай грамадска - палітычнай і культурна - масавай работай сярод насельніцтва і рабочых калектываў будоўляў. Прачытана 682 лекцыі, дадзена больш 160 канцэртаў мастацкай самадзейнасці, працавала 26 піянерлагераў-спадарожнікаў, абсталявана 7 вучэбных кабінетаў, 6 піянерскіх пакояў, пабудавана 19 спортпляцовак, добраўпарадкаваны 4 стадыёны, перададзена ў бібліятэкі сельскіх школ і клубаў 700 кніг, праведзена 111 суботнікаў і нядзельнікаў. Студэнты шэфствавалі над 20 помнікамі загінуўшым воінам і партызанам. Усе атрады прынялі актыўны ўдзел у правядзенні кампаній «Моладзь выкрывае імперыялізм» і «Савецкі народ — пакарыцель космасу». Пры атрадах працавала 37 кансультацыйных пунктаў і 34 бюро добрых паслуг — вось далёка не поўны пералік спраў універсітэцкага камсамола ў трэцім семестры гэтага года.

Сёння з вялікай павагай мы можам гаварыць аб лепшых атрадах, пераможцах сацспаборніцтва ў гонар 50-годдзя ўтварэння СССР. Гэта атрады «Верасок», «Буравеснік» (філфак), «Нептуній» (хімфак), «Лагаза», «Брыганціна» (матфак), «Імпульс» (фізфак), «Градыент» (ФПМ).

З вялікім энтузіязмам папрацавалі і нашы інтэрнацыянальныя атрады. Атрад «Беларускі», які выязджаў у ГДР (камандзір В. Протчанка, камісар А. Тозік), за ўдарную работу і вялікую інтэрнацыянальную грамадска-палітычную дзейнасць узнагароджан Ганаровым медалем Саюза Свабоднай нямецкай моладзі «За ўмацаванне братніх сувязей паміж ССНМ і ВЛКСМ». СБА імя Лілі Карастаянавай, які працаваў у НРБ, заваяваў II месца сярод сямі інтэрнацыянальных атрадаў з СССР, НРБ, ПНР і ГДР.

Поспехі нашых студэнцкіх будаўнічых атрадаў сталі магчымымі дзякуючы вялікай падрыхтоўчай рабоце камітэтаў камсамола і штабаў працоўных спраў факультэтаў.

Але, ацэньваючы работу атрадаў, паказваючы ўсё лепшае, нельга не сказаць і аб недахопах, якія перашкаджалі студэнтам працаваць яшчэ больш паспяхова. Так, у падрыхтоўчы перыяд штабы працоўных спраў, камітэты камсамола некаторых факультэтаў недастаткова ўдзялілі ўвагі падбору кіруючага звяна, строгай арганізацыі навучання байцоў атрадаў правілам тэхнікі бяспекі. Бескантрольна праводзіліся медагляд і прывіўкі, вучоба камандзіраў і камісараў. Канкрэтна гэта праявілася на СБА «Белая Русь», «Святлана». Камплектаванне гэтых атрадаў прайшло стыхійна, неарганізавана. Атрады былі сфарміраваны толькі дзякуючы ініцыятыве і вялікай арганізацыйнай рабоце камандзіраў Г. Красноўскага і О. Бастрыкава. Ні штаб СБА, ні камітэт камсамола юрфака не аказалі гэтым атрадам неабходнай дапамогі, а ўсю ўвагу сканцэнтравалі на выязных атрадах.

Слабымі аказаліся атрады «Рэзананс-4» і «Градыент» фізічнага факультэта (начальнік штаба А. Маёнаў). Тут камандзіры і камісары аказаліся непадрыхтаванымі да кіраўніцтва атрадамі. Атрад «Рэзананс-4» неаднаразова парушаў дысцыпліну і статут СБА. А атрад «Градыент» распаўся за пяць дзён да выезду на работу. Ён застаўся без камісара. Замест 40 чалавек у атрадзе аказалася ўсяго 15. Штаб працоўных спраў факультэта непрынцыпова аднёсся да падбору кіруючага звяна і ўсяго саставу гэтых атрадаў.

Слабей сваіх магчымасцей працаваў і падрыхтоўчы штаб гістарычнага факультэта (начальнік штаба А. Савойтан), атрады якога былі заўсёды аднымі з лепшых. У гэтым годзе атрад «Рэстаўратар» фарміраваўся неарганізавана. У ім аказаліся студэнты іншых факультэтаў. Слабая дысцыпліна прывяла да таго, што за парушэнне «сухога» закона атрад быў расфарміраван.

Заслугоўвае папроку і цэнтральны штаб СБА універсітэта (начальнік У. Адамушка, камісар М. Ніканоранкаў), які не змог наладзіць добрую вучобу камандзіраў і камісараў, работу «школы майстра», не забяспечыў большасць атрадаў талонамі тэхнікі бяспекі, а ў рабочы перыяд не здолеў наладзіць пастаянны кантроль за СБА.

Улічваючы ўсе гэтыя недахопы, штабам і камітэтам камсамола факультэтаў надалей асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на навучанне ўдзельнікаў працоўнага семестра правілам бяспекі пры вядзенні работ, павысіць адказнасць студэнтаў за падтрыманне тэхнікі бяспекі, фарміраваць атрады на базе акадэмічных груп. Гэта вялікая і карпатлівая работа. Вось чаму працоўны семестр 1973 года неабходна пачынаць сёння, калі яшчэ падводзяцца вынікі прайшоўшага працоўнага лета і свежыя ў памяці ўсе станоўчыя і адмоўныя аспекты арганізацыі работы.

Сучасны этап развіцця студэнцкага будаўнічага руху характарызуецца пошукам новых пунктаў прыкладання студэнцкіх сіл, якія б забяспечылі высокую эканамічную і выхаваўчую эфектыўнасць, сістэматызацыяй студэнцкага руху. У сувязі з гэтым падрыхтоўка СБА, работа з імі павінна весціся круглы год.

Бюро камітэта камсамола універсітэта пастанавіла сабраць у кастрычніку сход атрадаў, якія ўдзельнічаюць у працоўным семестры, правесці грамадска - палітычную атэстацыю кожнага байца, камісара і камандзіра. Неабходна ў бліжэйшы час перагледзець і зацвердзіць штабы працоўных спраў на факультэтах, а ва ўніверсітэцкім маштабе арганізаваць прафесіянальныя школы муляра, стропальшчыка і цесляра. У сувязі з гэтым неабходна вельмі старанна падабраць камандны састаў — камандзіраў і камісараў. Ад гэтай работы залежыць поспех працоўнага семестра 1973 года.

У. СІЛІН,
намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ.

*Надо, чтобы все дело воспитания, образования и учения современной молодежи было воспитанием в ней коммунистической морали.* **В. И. ЛЕНИН.**

# О КУЛЬТУРЕ ПОВЕДЕНИЯ СТУДЕНТА

**С каким волнением вчерашний абитуриент, а сегодня уже студент входит в университет! Как будто и не было конкурсных экзаменов... Строгие и неприступные ранее преподаватели теперь приветливы. Некоторые не обходятся без рукопожатия. В естественно вспыхивающих разговорах о профессии обращаются к студенту с непривычным для слуха словом «коллега». В перерывах между лекциями не спешат в профессорскую, а идут к студентам, советуют им прочитать ту или иную книгу, закуривая, предлагают молодому человеку папиросу... Как все это не похоже на вчерашнюю школьную жизнь! У всех приподнято-торжественное настроение. Но вот приходит в аудиторию куратор группы и сразу же старается настроить студентов на рабочую волну, на прозаический лад. Да и лекторы уже достаточно озадачили, дав длинные списки литературы для самостоятельной работы. Как справиться со всеми делами, чтобы не осрамиться, не огорчить родителей, не подвести школу! Как вести себя!**

**Университет! Храм науки! Станешь ли ты родным навсегда! Что нужно делать для того, чтобы не чувствовать себя лишним в вузе!**

**Эти и подобные им вопросы терзали каждого студента. О них и пойдет разговор. Заранее оговариваемся, что он касается не только первокурсников. Если бы все студенты старших курсов вели себя культурно, то можно было бы и не затевать специального разговора — этика поведения старших естественно передавалась бы младшим. К сожалению, приходится констатировать, что некоторые старшекурсники не только не умеют вести себя прилично, но даже щеголяют своей невоспитанностью. На замечание вызывающе отвечают: «А нас этому не учили... Правил поведения для студентов не разрабатывали...»**

**Да, это так: нет специальных правил поведения студента. Таких, как учащегося школы, например. Но ведь студент через несколько лет сам будет воспитателем. К тому же, есть в вузах свои традиции, нормы поведения и студентов и преподавателей.**

## КРИТЕРИЙ НРАВСТВЕННОГО ПОВЕДЕНИЯ

Хорошие манеры человека должны быть лишь проявлением его внутреннего отношения к окружающим, к миру. «Оплодотворяющим фактором всякой положительной работы, — подчеркивал М. И. Калинин, — является культурность». Человечество выстрадало самый лучший общественный идеал — коммунизм. Ему и подчинены все наши помыслы и стремления. Всё, что способствует торжеству этого идеала, является прогрессивным; все, что препятствует, — регрессивным. Следовательно, поведение человека тоже должно соответствовать требованиям времени. «В основе коммунистической нравственности лежит борьба за укрепление и завершение коммунизма», — говорил В. И. Ленин. Критерий морального поведения, учил он, определяется преданностью человека делу коммунизма. Эта преданность проверяется не громкими фразами, а практическими делами, пусть маленькими, незначительными, но конкретными, целенаправленными.

В современных условиях, когда советское общество достигло высокой степени однородности и в нашей стране установилось социальное и идейно-политическое единство всех слоев трудящихся, всех граждан, независимо от происхождения, рода занятий, национальности, пола, образования, появилась возможность выработать единые нормы и принципы поведения всех советских людей. Коммунистическая партия сформулировала их в моральном кодексе строителя коммунизма:

**— преданность делу коммунизма, любовь к социалистической Родине, к странам социализма;**

**— добросовестный труд на благо общества: кто не работает, тот не ест;**

**— забота каждого о сохранении и умножении общественного достояния;**

**— высокое сознание общественного долга, нетерпимость к нарушениям общественных интересов;**

**— коллективизм и товарищеская взаимопомощь: каждый за всех, все за одного;**

**— гуманные отношения и взаимное уважение между людьми: человек человеку — друг, товарищ и брат;**

**— честность и правдивость, нравственная чистота, простота и скромность в общественной и личной жизни;**

**— взаимное уважение в семье, забота о воспитании детей;**

**— непримиримость к несправедливости, тунеядству, нечестности, карьеризму, стяжательству;**

**— дружба и братство всех народов СССР, нетерпимость к национальной и расовой неприязни;**

**— непримиримость к врагам коммунизма, дела мира и свободы народов;**

**— братская солидарность с трудящимися всех стран, со всеми народами.**

Этот кодекс чести и борьбы нашего современника изложен в Программе КПСС, записан в Уставе партии. По нем и должен сверять свое поведение советский студент как гражданин нашей страны. Принципы морального кодекса строителя коммунизма должны превратиться в норму поведения каждого человека. Без этого мы не мыслим себе становление личности, гармонически сочетающей в себе духовное богатство, моральную чистоту и физическое совершенство. Утверждению в жизни норм коммунистической морали подчинен в нашей стране весь процесс обучения и воспитания подрастающего поколения, всей молодежи.

## СТУДЕНТ В АУДИТОРИИ

Культуру поведения и смысл нравственных норм можно и нужно раскрывать в специальных беседах, целенаправленных мероприятиях. Но это не самый лучший путь выработки у молодого человека нужных навыков и привычек. Воспитание в процессе обучения — вот основа формирования человека будущего. Воспитание и обучение — две стороны единой задачи. Счастлив тот, кто в студенческие годы приобрел черты подлинно советского интеллигента; жестоко будет наказан жизнью тот, кто, став образованным, не научился советскому образу жизни, коммунистической культуре.

Велика ответственность и преподавателей, которые должны нести студентам не только знания, но и передавать этику поведения. К сожалению, не все это понимают. Обидно бывает, когда порой приходится слышать от наших выпускников рассказы о различных чудачествах уважаемых нами специалистов - п р еподавателей на экзаменах и зачетах, на общих собраниях, на лекциях, семинарских занятиях. «Выгнал из аудитории», «наорал, а потом без опроса поставил оценку», «спрашивала, жуя конфеты, яблоко»... — эти ремарки не лучшим образом характеризуют некоторых преподавателей. Скажем прямо: такие случаи редки. Значительно больше фактов нетактичного, бесцеремонного поведения студентов, о которых великодушно умалчивают рассказчики, видя за теми или иными проказами однокашников проявление безобидных шалостей. Но как они дорого обходятся здоровью преподавателя, ибо за ними стоят шпаргалки, лицемерие, уловки и прочие неблаговидные поступки отдельных студентов. А надо так вести себя в студенческие годы, чтобы потом не стыдно было смотреть в глаза.

Позвольте напомнить несколько общеизвестных правил поведения, которые помогут студенту быть вежливым и тактичным:

При входе преподавателя в аудиторию и выходе из нее студенты приветствуют его вставанием. Лектора приветствуют в начале лекции и по окончании ее. Перерывы не всегда сопровождаются вставанием. Подниматься надо всем дружно и одновременно.

Во время чтения лекций, проведения семинарских занятий студент отвечает на вопросы преподавателя стоя. Если последний разрешит задавать вопросы и отвечать сидя, следует студенту его поблагодарить. На зачетах, экзаменах, на собеседовании в государственной распределительной комиссии студенту, как правило, разрешают отвечать сидя.

На занятиях студенты должны внимательно слушать преподавателей, не перебивать их, не дослушав мысли до конца. Основные положения лекции весьма полезно зафиксировать в конспекте, а потом просмотреть их еще раз дома. Пользоваться чужими записями не только некрасиво, но и нечестно.

Практические, семинарские занятия, собеседования, диспуты только тогда интересны и полезны, когда все студенты активны. Надо уметь выслушивать мнение товарищей и быть готовым самому принять участие в ответе, исправить ошибку или дополнить ответ. Готовность к этому появится лишь в случае систематической самостоятельной работы над первоисточниками, рекомендованной литературой. выполнения домашних заданий, лабораторных, курсовых и дипломных работ в установленные преподавателями сроки. Поменьше разговоров о перегрузках и побольше самодисциплины, самоорганизации! Координацией учебных планов специально занимаются методические комиссии преподавателей, кафедры, ученые советы, деканаты и ректорат. Не следует себя расхолаживать, особенно в период экзаменационных сессий. Зачеты и экзамены — форма государственного контроля за качеством обучения студентов, поэтому их надо сдавать в установленные сроки, исключительно добросовестно.

«С самого начала своей работы приучите себя к строгой последовательности знаний. Изучите азы науки, прежде чем попытаться взойти на ее вершины. Никогда не беритесь за последующее, не усвоив предыдущего», — завещал академик И. П. Павлов.

Углублению знаний, умению применять их в практической деятельности, выработке научного мышления, критического отношения к фактам способствует активная работа в студенческом научном обществе. Не следует бояться при этом черновой работы. Надо уметь делать все, что предусматривается специализацией.

На занятия опаздывать нельзя. Не должно быть пропусков их без уважительных причин. Очень неприлично заниматься на лекции посторонними делами. Лекция — важнейший источник знаний, хороший путеводитель в могучем потоке информации. Как правило, успешнее занимается тот студент, который раньше это поймет.

В случае болезни студент предъявляет деканату (куратору группы) справку лечебного учреждения, не дожидаясь напоминания. Следует помнить, что староста группы — твой друг и помощник, он должен знать первым причину отсутствия однокурсника на занятиях. Нельзя обижаться на его строгость — она вам на пользу.

Студент должен бережно относиться к приборам, оборудованию, учебным пособиям, которые являются государственной собственностью.

Приятно заниматься в чистой и проветренной аудитории. Поддержание порядка в ней: чистая доска, наличие мела, указки, проветривание помещения во время перерыва, включение и выключение света и т. п. — забота студента.

Курить в аудитории строго воспрещается! — для этого есть специально отведенные места. И вообще — лучше не курить совсем.

## ВЫ ПРИШЛИ В ЧИТАЛЬНЫЙ ЗАЛ

Прежде чем повести разговор о культуре студента, я побывал в нашей библиотеке и спросил у ее сотрудников, следует ли напоминать об элементарных правилах поведения в читальном зале, книгохранилище и т. д. Побеседовал и с молодыми читателями. И та и другая стороны ответили, что стоит. Да и в самом деле, ведь этот вопрос выходит за рамки простого этикета.

Книголюб и студент — неразделимые понятия. Однако не у каждого студента есть возможность иметь личную библиотеку. Да она и не сможет заменить государственные и публичные книгохранилища. Прежде чем стать читателем, т. е. получить право пользоваться книжным фондом библиотеки или читального зала, студент должен зарегистрироваться у дежурного библиотекаря, предъявив свой паспорт и студенческий билет, подробно познакомиться с правилами для читателей.

Нужно быть тактичным и вежливым в обращении с обслуживающим персоналом, выполнять все требования и советы библиотекаря.

В читальных залах или кабинетах по специальным отраслям знаний каждый студент должен поддерживать порядок и тишину, деловую, рабочую атмосферу, не перешептываться с товарищем, возникшие вопросы лучше обсудить в фойе, читать не вслух, а только про себя, не мешая рядом сидящим, не отвлекая их от работы над книгой.

Студент должен бережно обращаться с книгами и другими печатными изданиями, предоставленными ему библиотекой или читальным залом, кабинетом. Не следует подчеркивать текст, делать какие бы то ни было пометки на страницах книги, перегибать страницы, вырывать листы, копировать иллюстрации посредством кальки и т. д.

Некультурно и негигиенично перелистывать книги и другие печатные издания пальцами, смоченными слюной. В этом случае загибаются угол-

*(Продолжение на 4-й стр.).*

# О КУЛЬТУРЕ ПОВЕДЕНИЯ СТУДЕНТА

*(Окончание. Начало на 3-й стр.).*

ки страниц, треплются страницы книг, на чистых листах остаются грязные отпечатки, книга портится. Надо обязательно отказаться от этой некрасивой, лишенной всякой эстетики привычки.

Следует помнить, что книжный фонд библиотеки является народным достоянием. Поэтому нельзя терять полученные книги и другие печатные издания. В случае же утери надо вернуть библиотеке равноценные издания или возместить убыток в установленном библиотекой порядке, не дожидаясь напоминания и предупреждения.

Студент должен сдать имеющиеся у него книги дежурному библиотекарю, уходя из читального зала на продолжительное время. Нельзя выносить книги из читального зала, уносить их домой; они нужны другим студентам, вашим товарищам.

Не надо задерживать более положенного срока взятые домой библиотечные книги. Нужно постараться вернуть их досрочно, так как на них рассчитывают другие студенты.

После окончания учебного заведения, перед выездом на работу по направлению, культурный студент не забудет вернуть все книги в библиотеку, поблагодарить обслуживающий персонал и выписаться из библиотеки.

## КАК В РОДНОМ ДОМЕ

Значительная часть студентов проживает в общежитии. Безусловно, от многих удобств, которыми располагают живущие в благоустроенных квартирах однокурсники, им приходится отказываться. Но, как правило, они на это не сетуют: где еще приобретешь столько друзей, научишься экономно жить, считаться с другими, освоишь науку самообслуживания?

Но чтобы жизнь ничем не омрачалась, студент должен строго соблюдать правила внутреннего распорядка в общежитии. Они типовые, поэтому никто не должен претендовать на исключительность.

Комендант вручает студенту постоянный пропуск в общежитие, который он должен предъявлять при входе дежурному или вахтеру. Впрочем, предоставим слово коменданту общежития:

— Студенты должны беречь предоставленные в их пользование здание общежития, его оборудование, мебель, жесткий и мягкий инвентарь, все имущество для индивидуального и общего пользования (электроплитки, электроутюги, репродукторы, торшеры, телевизор, пианино и т. д.), являющиеся государственной собственностью.

Нельзя считать культурным студента, который не соблюдает чистоты, порядка в жилых комнатах и местах общего пользования, неаккуратно убирает постель или вовсе не застилает свою койку.

Введение самообслуживания в общежитиях обязывает каждого по графику производить уборку жилых комнат, коридоров и мест общего пользования (комнаты отдыха, ленкомнаты, читального зала, кухни и т. д.).

Нельзя самовольно переносить инвентарь общежития из одной комнаты в другую или с одного этажа на другой, нельзя производить переделку в электропроводке, заменять установленные электролампочки, включать дополнительные источники света.

Студент, который уходит из комнаты последним, должен выключить свет. Долг каждого заботиться об экономии электроэнергии. Нельзя оставлять включенными в розетки электроплитки и утюги в местах общего пользования. Это может привести к пожару.

Во избежание пожара нельзя бросать непогашенные окурки и спички в пепельницы и урны, если бы они даже находились в специально отведенных для курения местах. Курить в жилых комнатах воспрещается. Надо чаще проветривать жилые помещения.

Нельзя распивать в комнатах общежития спиртные напитки. Следует помнить, что алкоголизм и курение — враги нашего здоровья. Сами по себе курение и злоупотребление спиртными напитками не являются признаками высокой культуры человека.

Следует регулярно, в сроки, установленные комендантом общежития, менять постельное белье.

Готовить пищу, стирать и утюжить белье, чистить одежду и обувь следует в специально отведенных для этого местах.

Некрасиво развешивать за окном или на балконе сетки с продуктами. Такие «украшения» портят вид здания и даже улицы, а советский студент не может стоять в стороне от борьбы за эстетику нашего быта.

Личные вещи (ящики, чемоданы, свертки), которые не требуются повседневно, лучше сдать в камеру хранения, чтобы они не стесняли проживающих в комнате товарищей.

Не рекомендуется выставлять на подоконник радиолу, проигрыватель или магнитофон, включив без надобности на полную громкость. Если студент в комнате пользуется с согласия товарищей радиолой, магнитофоном, транзисторным приемником и т. д., то следует уменьшить громкость звука так, чтобы не мешать товарищам в соседней комнате заниматься своими делами.

Уезжая из общежития на каникулы домой, в командировку, без напоминания надо сдать постельные принадлежности и другие взятые ранее вещи для индивидуального и общего пользования. Отъезжающие в связи с окончанием учебного заведения, кроме этого, должны полностью рассчитаться за проживание в общежитии, сдать ордер, сняться с воинского учета и выписаться с помощью паспортиста из общежития,— заканчивает перечень своих просьб комендант.

Поблагодарив его, добавим и мы несколько полезных советов.

Студент, проживающий в общежитии, несет большую моральную ответственность за свое и приглашенных лиц поведение. Гости тоже должны поддерживать установленный комендантом и студсоветом порядок: проходить в общежитие по разовому пропуску или удостоверению личности, не засиживаться до поздней ночи, когда хозяевам уже пора ко сну, не создавать шумных компаний. Вообще, со своими друзьями студенту лучше встретиться в кафе, кинотеатре или других общественных местах, где люди отдыхают, а не работают, как в общежитии.

Очень неприятное впечатление производят те студенты, которые валяются одетыми на постели, бросают верхнюю одежду на кровать, курят в комнате, развешивают белье, костюмы на стульях, сорят.

Некрасиво вывешивать в жилых комнатах объявления, расписания занятий, семейные фотографии над своей кроватью, вырезки из газет и журналов, лозунги типа «Красота — это одухотворенность», фото полюбившихся кинозвезд, спортсменов и т. д.

Надо делать все возможное, чтобы общежитие стало родным домом. И, конечно, следует активно поддерживать все массовые мероприятия студсовета.

## БЫТЬ ВСЕГДА ЭНТУЗИАСТОМ

Бесспорно, что основная задача студента — успешная учеба. Но жизнь тогда проходит интересно, когда она заполнена до краев хорошими делами. Социологические исследования показывают, что хорошо занимающиеся студенты, как правило, наиболее активны в общественной работе. Неправда, что она мешает учебе. Надо только выбрать посильное и по душе занятие, не перегружать себя многими общественными поручениями. Вспомните, как в первые дни учебы хотелось записаться чуть ли не во все спортивные секции, кружки художественной самодеятельности. Еще бы: такие возможности по сравнению со школой! Прошло время — и энтузиазма поубавилось, а у некоторых (что никак нельзя считать нормальным!) совершенно пропало желание заниматься общественно полезными делами.

Студент должен активно участвовать в общественной работе: комсомольских, профсоюзных организациях, ДОСААФ, лекционной пропаганде, шефской работе. Особой его заботой должна быть деятельность по коммунистическому воспитанию студенчества, по оказанию помощи школьным комсомольским и пионерским организациям.

Много полезного приобретает студент, участвуя в органах студенческого самоуправления, работе народных дружин по охране и поддержанию общественного порядка, комсомольских прожекторов.

А кто не пожелает воспользоваться возможностью получить дополнительную профессию в университетских кружках и школах общественных профессий! Или, скажем, почему бы не взять шефство над желающими в скором времени поступить в вуз рабочими? Обучая других, многому научишься и сам.

Короче говоря, студенческие годы — годы воспитания социальной активности личности.

## ЭЛЕМЕНТАРНЫЕ ПРАВИЛА ХОРОШЕГО ТОНА

Сколько общеуниверситетских, факультетских, товарищеских вечеров, посещений театров, кино, интересных встреч со знатными людьми ожидает каждого молодого человека, каждую девушку в студенческие годы! Гостеприимный Минск любит студентов. И они своим внешним видом, хорошим поведением украшают наш город. Там, где студенты, всегда веселье, замечательное настроение. Они элегантны, культурны, ведут себя просто и естественно, как подлинные представители советской интеллигенции. У многих из них можно поучиться хорошим манерам, приличному поведению. Каковы основные нормы их советского этикета?

Основное правило хорошего этикета можно формулировать так: преимущество имеют — женщины перед мужчинами, старшие перед младшими, инвалиды и больные перед здоровыми.

При встрече с сотрудниками университета студенты первыми приветствуют их. Если это происходит на улице, молодой человек должен приподнять шляпу, не доходя нескольких шагов до встречного, с которым намеревается здороваться. Шапку без козырька и берет с головы не снимают. Здороваясь, нужно смотреть в глаза тому, к кому обращаетесь, не забыв при этом слегка поклониться. Держать руки в карманах, папиросу во рту — недопустимо. Подавать для пожатия руку можно лишь в том случае, когда старший по возрасту или положению первым протянет свою. Студенты-юноши всегда первыми приветствуют девушек, руку подавать право имеют последние.

Если после занятий вы снова встречаетесь в другом месте, не забудьте еще раз поприветствовать: русский язык располагает богатым выбором слов для выражения удовольствия — «вот мы и снова встретились», «мое почтение», «приятно вас видеть», «желаю удачи»... Подавая руку мужчине, женщина может не снимать перчатки, рука же мужчины должна быть без перчатки. Когда рукопожатием обмениваются равные по возрасту и положению мужчины, они могут не снимать перчаток. Однако, если снял один, другой должен последовать примеру.

Студенты, встретив преподавателя или старшего по возрасту в дверях, просят их пройти первыми; уступают им место в общественном транспорте. В разговоре с ними студент дает возможность им высказаться первыми. Не следует давать советов старшему, если он за ними не обратился. Если же хочется их дать, то следует вежливо попросить у старшего разрешения. В споре не следует повышать голос, а тем более переходить на грубость. Не следует раздражаться по мелочам, нервничать без причины.

Нельзя фамильярничать, кокетничать, усваивать театральные жесты, рисоваться. Это просто смешно. Неприлично преподавателя называть только по фамилии, особенно обращаясь к нему.

Знакомя людей, следует представлять мужчину женщине, младшего — старшему, предварительно спросив на это разрешения.

Подать женщине пальто — долг вежливости мужчины, но не его обязанность. За эту услугу женщина должна поблагодарить и не отказываться от нее. И вообще, приятнее, когда девушки не забывают хотя бы кивком головы благодарить за оказанные им любезности.

Попутно заметим, что очень неприлично ходить в пальто и головном уборе по коридорам учебных корпусов, разваливаться, опираясь на подоконники, и садиться на них.

Некоторые не стесняются ходить с чемоданами и сетками с продуктами... Для окружающих вид их неприятен. Воспользуйтесь, пожалуйста, еще некоторыми нашими советами:

Не смейтесь с неистовой шумливостью. Никогда не смейтесь без причины.

Не отказывайтесь, когда вас просят что-нибудь спеть или сыграть, если можете это сделать. Хорошие стихи, веселые шутки никогда не помешают.

Не разговаривайте слишком громко с целью завладеть разговором. Не шепчите в компании, подождите более подходящего случая для беседы. Не вмешивайтесь без разрешения в чужой разговор, не повторяйте сплетен и непроверенных фактов и слухов.

Не говорите только о своих делах или о самом себе. Тема разговора должна интересовать всех принимающих участие в беседе.

Следите за культурой речи, избегайте слов-паразитов, непонятной терминологии и грубых выражений.

Находясь в обществе, держитесь с достоинством, не делайте уступок в убеждениях ради того, чтобы поддерживать настроение собеседника.

Упорно воспитывайте в себе деликатность.

Никогда никуда не опаздывайте, но и не торопитесь. Аккуратность во времени—признак большой культуры человека. Если задерживаетесь где-то по уважительной причине, постарайтесь заранее оповестить заинтересованных лиц.

Полезных советов множество. Все они просты и разумны, составляют элементарные черты общечеловеческой нравственности.

Однако дело не столько в усвоении свода тех или иных правил поведения, манер хорошего тона — на любой случай жизни ими не запасешься. Главное — быть внутренне культурным, любить людей, заботиться об общем благе. Если будешь стараться создать удобства другим, хорошие манеры и привычки придут сами собой. Для того же, чтобы подняться до уровня такой культуры, в основе которой лежит гуманизм, стремление быть другому другом и братом, надо иметь на вооружении передовую идеологию. Именно такой идеологией и является коммунистическая идеология. Ее теоретическая основа — марксизм-ленинизм, как высшее достижение культуры человечества.

С. ЛАПТЕНОК, доцент.

### СОВЕТУЕМ ПРОЧЕСТЬ


**Ленин В. И. Задачи союзов молодежи. ПСС, т. 41.**

**Программа Коммунистической партии Советского Союза. Госполитиздат. Москва, 1961.**

**Речь Брежнева Л. И. на XVI съезде ВЛКСМ 26 мая 1970 года.**

**Мораль как ее понимают коммунисты. Изд. 3-е, испр. и дополн., Москва, Политиздат, 1966.**

**Основы марксистско-ленинской этики. Изд-во «Высшая школа», Минск, 1965, стр. 151—158.**

**Кассиль Лев. Разговор о культурном человеке. (Заметки писателя). Госполитиздат, 1961.**

**Кассиль Лев. Дело вкуса. (Заметки писателя). Изд-во «Искусство». Москва, 1964.**

**Крижан Э., Орлик Ю. Как себя вести. Изд-во «Обзор Братислава», 1966.**

**Первенцев Арк. Разговор о культурном человеке. (Заметки писателя). Изд-во «Московский рабочий», 1959.**

**Свадковский И. Ф. О культуре поведения советской молодежи. Изд-во «Знание», Москва, 1959.**

# У ЦЕСНАЙ САДРУЖНАСЦІ

Бурнае развіццё сучаснай прамысловасці і пастаяннае ўскладненне яе прадукцыі — факт бясспрэчны і відавочны. Ужо параўнаўча даўно стала намячацца тэндэнцыя: больш рэнтабельнай аказваецца цесная кааперацыя групы прадпрыемстваў, чым стварэнне вялікіх універсальных камбінатаў у кожнай з асобных частак раіны. Тое ж самае можна сказаць і аб сучаснай навуцы, асабліва аб тых галінах, якія непасрэдна звязаны з вытворчасцю і прамысловасцю. Многія навукова-даследчыя інстытуты і навучальныя ўстановы, якія вядуць даследчую работу, выконваюць шэраг заданняў па дагавору з прамысловымі прадпрыемствамі або іншымі інстытутамі. Гэтым дасягаецца вялікая эканомія сродкаў, якія трацяцца на навуковыя даследаванні. Эфектыўней і вынікі, паколькі работы гэтыя вядуць высокакваліфікаваныя калектывы ў кожнай са спецыяльных галін. Да таго ж дагаворная работа садзейнічае спецыялізацыі, а тым самым і паглыбленню ведаў. Навуковыя кантакты ў такой форме не толькі не вядуць да «звужэння гарызонтаў», але дазваляюць навуковым работнікам пазнаёміцца з сумежнымі галінамі навукі.

Хімічны факультэт БДУ выконвае вельмі вялікую колькасць дагаворных работ і падтрымлівае сувязі як з інстытутамі і прадпрыемствамі Беларусі, так і з падобнымі арганізацыямі іншых рэспублік. Міжрэспубліканскае супрацоўніцтва мае асабліва вялікае значэнне. Мы не толькі дапамагаем братнім рэспублікам у рашэнні канкрэтных задач, але і садзейнічаем умацаванню аўтарытэту нашых навуковых дасягненняў. Можна прывесці некалькі прыкладаў такога плённага супрацоўніцтва.

Кафедра радыяцыйнай хіміі нашага факультэта выконвае даследчую работу па ачыстцы сцёкавых вод цэлюлозна-папяровых прадпрыемстваў радыяцыйна-хімічнымі метадамі для Ленінградскага навукова-даследчага інстытута папяровай прамысловасці. На кафедры аналітычнай хіміі выконваецца аналіз стандартных узораў латуні па дагавору з Мцэнскім філіялам Інстытута гіпраметколерапрацоўкі. Дагавор заключан на тры гады, а пасля, відаць, будзе прадоўжан. Кіеўскі навукова-даследчы інстытут заключыў дагавор з кафедрай высокамалекулярных злучэнняў нашага факультэта па сінтэзу тэрмапластычных матэрыялаў. Дагавор таксама заключан на тры гады.

Сучаснае абсталяванне, якім ганарыцца наш факультэт, не раз прыходзіла на выручку вучоным іншых рэспублік. Для Інстытута біяхіміі АН Літоўскай ССР, напрыклад, на кафедры «Будова рэчыва» выконваюцца даследаванні структуры некаторых біялагічна важных аб'ектаў метадам ядзернага магнітнага рэзанансу (ЯМР).

Цікава адзначыць, што супрацоўніцтва можа ўзнікнуць паміж знешне зусім не звязанымі галінамі. Напрыклад, супрацоўнікі Вільнюскага Інстытута крыміналістыкі не раз прыязджалі раіцца з нашымі хімікамі. У сваю чаргу супрацоўнікі хімфака часта выязджаюць на кансультацыі і стажыроўку ў інстытуты іншых рэспублік.

Прыемна бачыць, што з кожным годам міжрэспубліканскія навуковыя кантакты растуць і мацнеюць.

**А. РАБЦАЎ,**
**асістэнт кафедры «Будова рэчыва».**

# ПАРТЫЙНЫ БІЛЕТ—ТВОЙ ГАЛОЎНЫ ДАКУМЕНТ

*У адпаведнасці з рашэннямі XXIV з'езда партыі майскі Пленум ЦК КПСС пастанавіў правесці ў 1973—1974 гадах абмен партыйных дакументаў членаў КПСС.*

*Ён павінен садзейнічаць паляпшэнню дзейнасці ўсіх партыйных арганізацый, узмацненню іх барацьбы па выкананню планаў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, пастаўленых XXIV з'ездам КПСС.*

*Абмен партдакументаў неабходна ў поўнай меры выкарыстаць для далейшай актывізацыі ўнутрыпартыйнага жыцця, удасканалення метадаў партыйнага кіраўніцтва, павышэння ўзроўню ідэйна-выхаваўчай і арганізатарскай работы.*

*ЦК КПСС зацвердзіў узоры новых партыйных дакументаў. Адпаведна з указаннямі XXIV з'езда КПСС і пажаданнямі камуністаў на новых партыйных дакументах будзе партрэтнае ізабражэнне заснавальніка і правадыра нашай партыі Уладзіміра Ільіча Леніна. Партыйныя білеты новага ўзору разлічаны на 22-гадовы тэрмін. Паспяховае правядзенне абмену партыйных дакументаў будзе спрыяць далейшаму ўмацаванню радоў нашай партыі, павышэнню яе кіруючай ролі ў грамадстве, паляпшэнню ўсёй дзейнасці партарганізацый па выкананню Дырэктыў XXIV з'езда КПСС.*

## ПРЫЗНАЧЭННЕ ПАРТБІЛЕТА

Партбілет — гэта асноўны дакумент, які вызначае партыйную прыналежнасць камуніста. Выдаецца на рукі не пазней, чым у дэкадны тэрмін з дня зацвярджэння бюро райкома рашэння пярвічнай арганізацыі аб прыёме ў члены КПСС. Прад'яўляецца партыйны білет толькі ў партыйных органах.

У білеце рэгулярна адзначаецца ўплата членскіх узносаў. Дастаткова глянуць на адпаведныя старонкі гэтага дакумента, і адразу будзе ясна, наколькі акуратна ты падтрымліваеш сувязі з партыйнай арганізацыяй, дысцыплінаваны ты чалавек ці недысцыплінаваны.

Абавязковым дадаткам да партбілета з'яўляецца ўліковая картка, у якую заносяцца асноўныя даныя пра камуніста. На рукі яна не выдаецца, а захоўваецца ў той партыйнай арганізацыі, дзе камуніст стаіць на ўліку. Уліковая картка і білет маюць аднолькавы нумар. Гэта дазваляе заўсёды праверыць, ці сапраўды білет належыць таму, хто яго прад'яўляе. Такім чынам, партыйны білет служыць важнейшым звяном у сістэме ўліку членаў нашай партыі.

Асновай уліку членаў партыі зараз з'яўляецца так званая сістэма адзінага партыйнага білета, у якую ўваходзіць рад дакументаў, якія пацвярджаюць прыналежнасць да КПСС, і адзіны для ўсіх партарганізацый парадак іх уліку, афармлення, выдачы, пагашэння.

Але такая сістэма існавала не заўсёды. У першыя гады стварэння і дзейнасці нашай партыі ніякіх білетаў не было.

У гады царызму пісьмовыя дакументы не выдаваліся. Партыя знаходзілася ў глыбокім падполлі, камуністы працавалі нелегальна, трымаючы строгую канспірацыю. Прафесійныя рэвалюцыянеры, што пераязджалі з адной партыйнай арганізацыі ў другую, карысталіся паролямі і партыйнымі клічкамі.

Цікава, што партыйныя клічкі і канспіратыўныя прозвішчы многіх рэвалюцыянераў пасля сталі вядомымі ўсяму свету. Цяпер, напрыклад, вядома больш 160 псеўданімаў У. І. Леніна разам з варыянтамі аднаго і таго ж псеўданіма. Адной з першых партыйных клічак дваццацігадовага Уладзіміра Ульянава была Старык. У 1899 годзе выйшла фундаментальная работа У. І. Леніна «Развіццё капіталізму ў Расіі», якую ён падпісаў — Уладзімір Ільін. Хаваючыся ад праследаванняў, Уладзімір Ільіч жыў пад прозвішчамі Іарданаў, К. П. Іваноў і іншымі.

Але галоўным і найбольш распаўсюджаным псеўданімам Уладзіміра Ільіча быў псеўданім Ленін. Пад гэтым імем арганізатар і правадыр нашай партыі і першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы ўвайшоў у сусветную гісторыю.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года ў краіне пачаўся бурны рост бальшавіцкіх арганізацый. Існуючы ў падполлі парадак уліку партыі стаў непрыгодным. Тады і было пастаўлена пытанне аб увядзенні партыйных білетаў. ЦК распрацаваў узор членскіх білетаў і разаслаў яго ў мясцовыя арганізацыі.

У Петраградскай партыйнай арганізацыі білеты членам партыі выдаваліся ўжо ў сакавіку 1917 года.

Зараз мы раскажам пра адзін з тых білетаў.

## ПАД НУМАРАМ 600

Людзі, якім пашчасціла сустракаць У. І. Леніна на Фінляндскім вакзале ў знамянальны дзень яго вяртання з эміграцыі ў Расію, зберaглі ў памяці адзін з найбольш хвалюючых эпізодаў гістарычнай падзеі: Ільічу, якога віталі шматлікія дэлегацыі рабочых, чырвонаармейцаў, салдатаў, матросаў, уручаюць партыйны білет № 600 Выбаргскай раённай арганізацыі бальшавікоў Петраграда.

Вядомы і абставіны, пры якіх партыйны білет № 600 быў выпісан на імя Уладзіміра Ільіча.

У кожнага райкома Петраградскай арганізацыі была свая нумарацыя дакументаў. Пасля выхаду партыі з падполля Выбаргскі райком паспеў ужо выдаць 599 білетаў, калі ў супрацоўнікаў райкома ўзнікла думка: Леніна можна чакаць у Петраградзе з дня на дзень. Партыйны білет № 600 трэба зберагчы для яго.

І вось 3 красавіка 1917 года на плошчы Фінляндскага вакзала ў Петраградзе Леніну быў уручан партыйны білет. А нядзельным майскім днём гэтага ж года партыйныя актывісты Выбаргскай стараны ўбачылі Уладзіміра Ільіча ў сваім райкоме. Ён прыйшоў разам з Надзеждай Канстанцінаўнай Крупскай, каб заплаціць членскія ўзносы.

Перамога Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі зрабіла ленінскую партыю партыяй, якая атрымала ўсю ўладу. Аўтарытэт яе непамерна ўзрос. Гэта рэзка павялічыла цягу ў рады партыі новых членаў. Само жыццё паставіла пытанне аб упарадкаванні ўліку камуністаў, без чаго немагчыма было забяспечыць эфектыўнае далучэнне кожнага члена партыі да барацьбы за сацыялізм.

Партыйныя білеты (членскія карткі) 1917—1919 гадоў не былі аднолькавага ўзору. У кожным месцы, губерні яны мелі сваю нумарацыю, колер, размер, змяшчалі розную колькасць звестак. Гэта перашкаджала цэнтралізацыі ўліку і размеркаванню сіл, ствярала ўмовы для парушэння партыйнай дысцыпліны.

На VIII з'ездзе партыі (сакавік 1919 года) было прынята рашэнне аб перарэгістрацыі ўсіх членаў партыі. У час перарэгістрацыі спекулятыўныя антыпартыйныя элементы, што прымазаліся да партыі, былі выключаны. Усім членам партыі былі заменены старыя партыйныя білеты на новыя.

## АДЗІНАГА ЎЗОРУ

Гэтая работа была закончана ўжо к канцу 1920 года. Новыя білеты адрозніваліся ад старых тым, што ўсе яны былі адзінага фармату, змяшчалі аднолькавыя даныя пра камуністаў. У старыя білеты ўключаліся Праграма, Статут партыі, у новых іх не было.

Новы білет меў выгляд кніжачкі ў 33 старонкі. У ім былі змешчаны біяграфічныя звесткі пра камуніста, штомесячна рабіліся адзнакі аб яго грамадскай дзейнасці, пераездах, камандзіроўках, спагнаннях.

Пасля X з'езда партыі ЦК РКП(б) прыняў пастанову аб правядзенні генеральнай чысткі партыі, якая, па словах У. І. Леніна, павінна была ачысціць партыю ад мазурыкаў, ад бюракратаў, ад несумленных, ад няцвёрдых камуністаў, ад меншавікоў, што перафарбавалі свой «фасад», але засталіся ў душы меншавікамі. Пасля гэтага партыя правяла ў 1922 годзе абмен партбілетаў.

Партбілеты ўзору 1922 года значна адрозніваліся ад папярэдніх. Яны мелі друкаваную нумарацыю, былі меншыя па фармату, таму што змяшчалі толькі асноўныя даныя — прозвішча, імя, год нараджэння камуніста, час уступлення ў партыю, назву арганізацыі, якая выдала білет, подпіс камуніста і сакратара укома(райкома), пячаць і дату выдачы дакумента, а таксама звесткі аб уплаце членскіх узносаў.

Усе іншыя звесткі пра члена партыі былі перанесены ў асабістую справу, якая мела аднолькавы з партбілетам нумар і зберагалася ў той арганізацыі, дзе ён стаяў на партыйным уліку.

У 1927 годзе быў праведзен чарговы перапіс камуністаў і абмен партыйных дакументаў. Форма білета не змянілася, але замест асабістых спраў была ўведзена адзіная ўліковая картка.

## ПАРТБІЛЕТ № 0000001

У 1927 годзе праводзіўся абмен партыйных дакументаў. На пасяджэнні бюро Замаскварэцкага райкома Масквы адзін са старэйшых бальшавікоў-ленінцаў Аляксандр Мітрафанавіч Стопані прапанаваў замацаваць навечна за Уладзімірам Ільічом Леніным партыйны білет нумар адзін. Усе горача падхапілі гэтую ідэю.

Як вядома, Цэнтральны Камітэт партыі падтрымаў прапанову замаскварэцкіх камуністаў і выдаў Замаскварэцкаму райкому партыі партыйны білет № 0000001 члена Усесаюзнай Камуністычнай партыі (бальшавікоў). У ім указана:

Прозвішча—**Ульянаў (Ленін).**

Імя і імя па бацьку—**Уладзімір Ільіч.**

Год нараджэння — **1870.**

Час уступлення ў партыю — **1893.**

Уладзімір Ільіч прымаў у жыцці Замаскварэцкай партыйнай арганізацыі найактыўнейшы ўдзел. Ужо на наступны дзень пасля прыезду з Піцера ў Маскву Ленін накіраваўся на завод Міхельсона, выступаў перад рабочымі, заклікаў аднавіць вытворчасць боепрыпасаў. Там жа ў Замаскварэцкім раёне на гэтым жа заводзе Уладзімір Ільіч разам з байцамі першых чырвонагвардзейскіх атрадаў прымаў воінскую прысягу.

Пасля абмен партыйных білетаў праводзіўся ў 1935 і 1936 гадах. Апошні абмен быў у 1954 годзе, пасля таго, як па рашэнню XIX з'езда КПСС партыя стала называцца Камуністычнай партыяй Савецкага Саюза. Але ў час кожнага чарговага абмену членскі білет № 1 нікому не выдаваўся. Гэты нумар навечна замацаваўся за партыйным білетам заснавальніка і кіраўніка партыі. Білет У. І. Леніна захоўваецца ў Цэнтральным партыйным архіве Інстытута марксізму-ленінізму.

## НАДЗЕЙНА БЕРАГЧЫ

Ніякіх правіл і інструкцый, дзе і як камуністу захоўваць свой партбілет, не ўстаноўлена. Ён павінен сам яго надзейна берагчы. Бо білет можа трапіць у рукі ворага партыі, шпіёна ці аферыста, які можа выкарыстаць яго. Таму страта білета — сур'ёзная партыйная віна, і партыя сурова спытае за халатныя адносіны да яго захавання.

Калі камуніст згубіў партыйны білет, ён павінен неадкладна паведаміць аб гэтым у сваю партарганізацыю. Яна высветліць абставіны, пры якіх гэта здарылася, і вырашыць, ці можа ў даным выпадку ісці размова аб выдачы новага дакумента.

Сапраўдны камуніст бачыць у партыйным білеце давер'е да сябе з боку партыі і даражыць гэтым давер'ем, ставіцца да свайго білета з вялікай беражлівасцю.

## З ПАРТРЭТАМ У. І. ЛЕНІНА

На XXIV з'ездзе КПСС было пастаўлена пытанне аб чарговым абмене партыйных дакументаў. Чым гэта выклікана?

З моманту апошняга абмену партыйных дакументаў мінула 17 гадоў. Тэрмін дзейнасці партбілетаў, на які яны былі разлічаны, закончыўся.

«Будзе правільным,—гаварыў у Справаздачным дакладзе Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў,—калі мы падыйдзем да абмену партыйных дакументаў не фармальна, а як да важнейшага арганізацыйна-палітычнага мерапрыемства. Трэба арганізаваць справу так, каб абмен партыйных дакументаў спрыяў далейшаму ўмацаванню партыі, павышэнню актыўнасці і дысцыпліны камуністаў.

Можна было б здзейсніць і шматлікія пажаданні камуністаў аб тым, — сказаў далей Л. І. Брэжнеў, — каб на партбілеце было ізабражэнне заснавальніка і правадыра Камуністычнай партыі Савецкага Саюза Уладзіміра Ільіча Леніна».

Гэта прапанова была сустрэта бурнымі, працяглымі апладысментамі дэлегатаў і гасцей з'езда.

Яшчэ раз хочацца нагадаць: партыйны білет — твой галоўны дакумент. Зберагай яго і апраўдвай права на валоданне ім сваімі справамі і ўчынкамі. Будзь, як гаварыў М. І. Калінін, камуністам з білетам, а не пры білеце.



*Вялікі атрад студэнтаў-фізікаў быў накіраван сёлетняй восенню на ўборку бульбы ў Бярэзінскі раён Мінскай вобласці.*

*НА ЗДЫМКАХ: студэнты фізфака на полі; парторг калгаса «Саюз» Бярэзінскага раёна Л. В. Пяняева расказвае аб справах студэнтаў дэкану фізфака І. П. Зяцькову.*

Фота *Д. Чаховіча.*

# «БУЛЬБА-4»

Наш грузавік нават у дождж ухітраўся быць запыленым, таму курткі і штаны маіх сяброў рабіліся шэрага колеру. Гэты грузавік разам з шафёрам Мішам стаў неад'емнай часткай нашага атрада «І + ІІ», гэта значыць першая і другая групы IV курса факультэта журналістыкі. За 25 хвілін, пакуль вязуць нас да бульбянога поля, мы паспяваем вырашыць шмат спраў: Шурык Елісееў расказвае апошнія сталічныя навіны (ён учора быў у Мінску), Толя Міснік — аб падзеях за мяжой, Вася — наш камандзір — аб тым, колькі тон мы накапалі ўчора. Ціха спяваюць дзяўчаты, жартуе Колька Мятла: ён набірае трупу акрабатаў і нават у дарозе трэніруецца. Ззаду — тры знаёмыя вёскі, наперадзе палі, палі, палі...

Наша праца ў саўгасе ў гэтым годзе — чацвёртая і апошняя. Але не толькі таму здаецца яна незвычайнай, а і таму, што наш атрад працуе не «апусціўшы рукавы», як бывала ў некаторых старшакурснікаў, а падняўшы іх і нават закасаўшы як мага вышэй. 12 тон у дзень — стала прывычнай нормай. А маленькая Тома Вашчанка— наша перадавіца. Зараз усе дасягнулі той мяжы, за якой начыста знікае стомленасць, таму пасля работы мы доўга не разыходзімся. Бярэ ў рукі гітару наш камісар Ваня Знаткевіч. Яго акружаюць цесным колам, і гучыць песня: «Забота у нас такая...».

Піянерскі лагер «Іскра» саўгаса «Бараўляны» стаў на месяц нашым домам. Мы палюбілі маленькія жоўтыя домікі, фантанчыкі, ціхія чырвона-жоўтыя алеі, палі навокал, якія неяк жартам назвалі Елісееўскімі, у гонар Шурыка Елісеева.

Сталовая. Тут збіраемся мы вечарамі. Тут святкавалі дзень нараджэння нашай аднакурсніцы Вікі Шынкевіч. Як старанна ўпрыгожвалі залу гірляндамі з жоўтага лісця нашы дзяўчаты! Люда Агароднікава гатавала прысмакі, а сяброўскія шаржы Тані Засім вызвалі дружны смех усіх: і гаспадароў, і гасцей — байцоў будаўнічага атрада медінстытута. А калі на ўрачыстай вячэры зачыталі з доўгага рулона віншаванне навароджанай, мабыць кожны з нас пашкадаваў, што не яго віншуюць тут, што гэта бульба — апошняя. Ды ці мала аб чым можна падумаць і пасумаваць дажджлівым асеннім вечарам, калі ў пакоі цёпла і ўтульна, калі побач сябры.

У пачатку трэцяга тыдня нашага «бульбянога жыцця» ў паветры павісла пытанне: Як выпусціць газету? Хутка на матыў папулярнай песенькі пад гітару камісара гэтыя радкі пачалі спяваць усім атрадам. Нарэшце абралі рэдкалегію. Яна была маладая, і ёй было нялёгка. Калі расказваць усё па-парадку, то першай з'явілася рубрыка «Гаворадь...» Аднойчы вечарам перабіралі падзеі мінулага тыдня, жартавалі, а нехта ціхенька «фіксіраваў» усё на бумазе. Потым дзяўчаты з флігеля ўсю ноч мерзнучымі пальцамі пісалі дэтэктыў аб нашым жыцці. Але самым цікавым быў дзень, калі ўсе матэрыялы і здымкі былі сабраны, і іх трэба было размясціць на двух лістах ватмана.

Калі хто ў гэту дажджлівую суботу і трапляў у нашу сталоўку, то імкнуўся як мага хутчэй уцячы. Амаль з ног да галавы перапэцканая фарбамі рэдкалегія і яе памочнікі, нейкія абрэзкі і абрыўкі паперы, спрэчкі аж но да хрыпаты — сапраўды маглі напалохаць любога.

Але ўсё было вельмі сур'ёзна і па-сапраўднаму. І вось ужо стаім мы «ля ног» любімай мучыцельніцы — «Нашай нівы».

Доўга будзем мы ўспамінаць гэту восень. Не раз на перапынках збяруцца ўсе разам, каб зноў і зноў расказваць смешныя здарэнні, а нехта скажа: «Памятаеце пажар?».

Гэта здарылася пасля абеду, калі хлопцы і дзяўчаты ў поўным рыштунку ішлі да машыны.

— Пажар! — крыкнуў Толя Кухарчук і, сарваўшы вогнетушыцель, кінуўся да лесу. За ім пабеглі астатнія. Курткамі, яловымі галінамі агонь удалося патушыць. А калі вярталіся назад у лагер, Толік са смехам прыпомніў, як бегла за ім услед загадчыца гаспадаркі і крычала, што вогнетушыцелі каштуюць грошай і што яна за іх адказвае. Смяяліся ўсе, забыўшыся на апечаныя рукі і сапсаванае адзенне.

Гавораць, што нашай работай кіраўніцтва саўгаса задаволена. А мы ўдзячны за ўсе турботы аб нас, за тое, што такая яна вясёлая атрымалася і цікавая наша апошняя бульба, «Бульба-4».

**Л. ПЕРАСЫПКІНА,**
Бараўляны — Мінск.



## ПАКАЗ ДАСЯГНЕННЯЎ

Ва універсітэтах братніх рэспублік да юбілею ўтварэння СССР рыхтуюцца фотавыстаўкі, якія раскажуць аб развіцці вышэйшай адукацыі ў гады Савецкай улады. Такая выстаўка будзе створана і ў нашым універсітэце. А пакуль рыхтуюцца экспазіцыі, якія расказваюць аб БДУ, для адпраўкі ў Кіеў, Ерэван і Казань.

**А. КУЗНЯЦОВА.**

## «САЮЗ НЕПАРУШНЫ РЭСПУБЛІК СВАБОДНЫХ»

**Пад такой назвай перыядычна афармляецца выстаўка кніг ва універсітэцкай бібліятэцы. Зараз на выстаўцы прадстаўлена літаратура Азербайджанскай, Армянскай і Грузінскай ССР.**

**Набліжаецца свята ўсяго савецкага народа — 50-годдзе ўтварэння СССР, і кожнаму цікава больш пазнаць аб развіцці і росквіце братніх рэспублік, бліжэй пазнаёміцца з творамі мастацкай літаратуры, з нацыянальнай культурай савецкіх народаў, з маляўнічымі куткамі нашай Радзімы. Кнігі Б. Афанасьева «Нарысы аб Арменіі», «Армянская ССР» (выдавецтва «Беларусь»), «Культура савецкай Грузіі» і шмат іншых задавальняюць інтарэсы зацікаўленых чытачоў.**

**Вялікае ўражанне пакідае прадстаўленая на выстаўцы мастацкая літаратура Закаўказскіх рэспублік: добрае выданне «Віцязя ў тыгравай шкуры» Шата Руставелі, «Марана» Андро Ламідзе, «Чалавек гор» Лео Кіачэлі, «Арлы паміраюць у небе» М. Асаціяні, лірыка Аванеса Туманяна і Ашота Грашы і інш.**

**М. МАЦЕЙКА.**

## ФАКУЛЬТЭТ ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ

ПРАЦЯГВАЕ НАБОР СТУДЭНТАЎ НА 1972-73 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД НА НАСТУПНЫЯ АДДЗЯЛЕННІ:

**ХАРЭАГРАФІЧНАЕ**
**РЭЖЫСЁРСКАЕ**
**ХОРМАЙСТАРСКАЕ**
**ЛЕКТАРАЎ**
**ПІЯНЕРСКІХ ВАЖАТЫХ**
**СУДДЗЯЎ І ГРАМАДСКІХ ІНСТРУКТАРАЎ ПА СПОРТУ.**

Тэрмін навучання на рэжысёрскім і харэаграфічным аддзяленнях—тры гады, хормайстарскім—два гады, на астатніх — адзін год.

Харэаграфічнае, хормайстарскае, рэжысёрскае аддзяленні рыхтуюць кіраўнікоў самадзейных калектываў.

Той, хто заканчвае факультэт, атрымлівае пасведчанне і права на работу па спецыяльнасці, набытай на адпаведным аддзяленні.

Пачатак заняткаў 15 кастрычніка. Заявы аб прыёме падаваць у камітэт камсамола універсітэта (207 пакой).

**Савет факультэта грамадскіх прафесій.**



У СКВЕРЫ КУПАЛЫ.
Фота Д. Чаховіча.

## «ЗВЯЗДА»

*ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ, ВЯРХОЎНАГА САВЕТА І САВЕТА МІНІСТРАЎ БССР.*

*Заснаваная ў жніўні 1917 года вядомымі дзеячамі Камуністычнай партыі М. Фрунзе і А. Мясніковым, «Звязда» заўсёды была з народам — у пярэдадзень Вялікага Кастрычніка, у гады грамадзянскай вайны, першых пяцігодак, калектывізацыі сельскай гаспадаркі. У грозную часіну Вялікай Айчыннай вайны газета стала падпольшчыцай, а потым — партызанкай.*

*За вялікія заслугі ў мабілізацыі беларускага народа на барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны «Звязда» ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны першай ступені. За плённую работу па камуністычнаму выхаванню працоўных Беларусі, мабілізацыі іх на выкананне задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва газета атрымала другі ордэн — Працоўнага Чырвонага Сцяга.*

*Сёння «Звязда» імкнецца як мага лепш дапамагаць рабочым і калгаснікам, работнікам партыйных камітэтаў і дзяржаўных устаноў, інжынерам і спецыялістам сельскай гаспадаркі, настаўнікам і ўрачам, людзям розных прафесій выконваць іх службовыя і грамадскія абавязкі, весці выхаваўчую работу сярод моладзі.*

*«Звязда» шырока асвятляе тэорыю і практыку партыйнай і прафсаюзнай работы, вопыт наватараў вытворчасці, навукі, авангардную ролю камуністаў. Шмат увагі ўдзяляе эканамічнай дзейнасці прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў, развіццю навукова-тэхнічнага прагрэсу.*

*Часта газета друкуе матэрыялы, прысвечаныя развіццю літаратуры і мастацтва, культурнай рабоце ў горадзе і вёсцы, разнастайную спартыўную інфармацыю.*

*«Звязда» шырока і разнастайна асвятляе ўсе актуальныя пытанні сучаснасці, міжнароднай і ўнутранай палітыкі Савецкага Саюза.*

*ВЫПІСВАЙЦЕ, ЧЫТАЙЦЕ СТАРЭЙШУЮ РЭСПУБЛІКАНСКУЮ ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА».*

*Падпіска прымаецца без абмежавання.*

*Кошт падпіскі: на год — 6 руб., на 6 месяцаў — 3 рублі.*

*Выходзіць шэсць разоў у тыдзень на беларускай мове.*

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 01428
Заказ 1112.
Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Тыраж 2 000 экз.